Добры дзень, мая дарагая сяброўка Маша! Сёння атрымала ад цябе ліст, з якога даведалася, што ты рыхтуешся да паступлення ў вышэйшую навучальную ўстанову, каб стаць у будучыні начальнікам аддзялення сувязі. О, як гэта цікава!

Дарэчы, кожны чалавек з дзяцінства марыць пра сваю будучыню. Ён увесь час назірае за працай дарослых. А тыя, бывае, і не заўважаюць, які накірунак яны даюць дзецям у выбары прафесіі. Таму ў адных людзей выбар яе супадае з марай дзяцінства, а ў другіх — не супадае.

Я задумалася, а чаму так бывае? Чаму адных праца акрыляе, а другіх – томіць?

Усё, мне здаецца, залежыць ад чалавека і яго выбару. Калі ты ўсю душу аддасі сваёй працы, яна абавязкова ўзніме цябе на пэўную вышыню. А калі ты не палюбіш тое, што робіш, то будзе праца ў цябе забіраць усе сілы, таміць цябе.

Сёння, Маша, я хачу пагаварыць з табой пра тваю будучую прафесію — непрыкметную, сціплую, нават, кажуць людзі, неперспектыўную.

Але ж давай паспрабуем разабрацца.

Пошта — гэта цэлы свой свет, буйная кампанія на рынку паслуг.

У цэнтральным рэспубліканскім вузле сувязі ўжо з самага ранку кіпіць праца. Тут ідзе сарціроўка карэспандэнцыі ў розныя куткі краіны. Адтуль яна паступае і ў наша аддзяленне сувязі, у якім працуе каманда паштальёнаў, аператараў разам з начальнікамі. Тут газеты і часопісы сарціруюцца па вуліцах горада да нас, адрасатаў. Паштальёны спяшаюцца даставіць навіны са свежымі газетамі, а таксама лісты ў канвертах, якія парадуюць доўгачаканымі паведамленнямі ад родных і блізкіх нам людзей.

Работа паштальёна складаная. Кожны дзень, у любое надвор'е крочаць яны ад дома да дома, ад вуліцы да вуліцы, несучы ў сумцы нялёгкую карэспандэнцыю. А гэта не толькі газеты і часопісы, а таксама пенсіі пажылым і хворым, людзям, якім заказаны лісты, падпіска, тэлеграмы.

І ўяві сабе, калі людзі сустрэнуць чалавека выпадковага, чэрстага, грубага і непрыветлівага, то які настрой выклікае ён у іх? Зразумела, што

непрыемны. Вось чаму важна на гэтым месцы ўбачыць добразычлівага, адкрытага паштальёна, бо ён для нас як сувязь са светам. А гэта будзе залежаць ад цябе, начальніка. Ты павінна будзеш адчуць душу такога чалавека.

Выбіраць прафесію трэба па сабе і з улікам сваіх якасцяў характару.

Але працягнем свой шлях і заглянем у аддзяленне сувязі. Тут, як у тым муравейніку, таксама кіпіць праца. Апературы, якія сядзяць за камп'ютарамі, выконваюць вялікі спектар паслуг: аплату, страхоўкі, фотазаяўкі, пераводы.

Ёсць і новая паслуга — паскораная пошта. Яна, як хуткая дапамога, не мае перашкод і ляціць ва ўсе канцы свету.

Праца аператара вельмі адказная, бо ён павінен быць уважлівым пры разліках з кліентамі, а таксама быць шчырым і ветлівым, бо ад яго, часам, залежыць далейшы настрой чалавека.

Усім гэтым павінен кіраваць начальнік, які дапамагае, я лічу, сваім работнікам, а таксама вырашае складаныя пытанні. Значыць, трэба быць адукаваным чалавекам.

Увесь час работнікі сувязі працуюць з намі, кліентамі, а гэта вельмі няпроста. Трэба заўсёды быць тактоўным.

А цяпер, Маша, падумай: ці проста быць работнікам сувязі?

Калі гэта ты ўсё зразумееш, тады і выбар будзе апраўданы, а работа твая будзе спорыцца, бо яна патрэбна ўсім нам, так як жывём мы ў развітай інфармацыйнай прасторы.

Я жадаю табе, Маша, поспехаў у вучобе і ўпэўнена, што ты зробіш правільны выбар а ў будучыні тваё аддзяленне сувязі будзе адно з самых сучасных і перспектыўных.

З павагай да цябе твая сяброўка Ліза. Да пабачэння! Пішы. Буду чакаць ад цябе ліст.